# НЯХАЙ ЖЫВЕ 1-е МАЯ—

## БАЯВЫ АГЛЯД РЭВОЛЮЦЫЙНЫХ СІЛ МІЖНАРОДНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТА!


1 МАЯ 1938 г.
№ 8-9 (60—61)

*Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся*

# ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

ОРГАН парткома, прафкома, рэктарыята Беларускага дзяржаўнага універсітэта




# *Першае Мая*



Першае мая — дзень міжнароднай брацкай салідарнасці, вялікае свята працы. Гэта свята для рабочага класа капіталістычных краін — дзень агляду баявых рэволюцыйных сіл, дзень мабілізацыі пролетарскіх батальёнаў на штурм капітала, на штурм фашызма.

У дзень Першага мая міжнародны пролетарыят, усё перадавое і прагрэсіўнае чалавецтва яшчэ і яшчэ раз звернуць свае погляды на краіну соцыялізма, на СССР — надзею і апору працоўных усяго свету ў іх барацьбе за мір, дэмакратыю, свабоду і соцыялізм.

Першага мая ўсё перадавое чалавецтва яшчэ вышэй узніме свой магутны пратэст супроць чорных фашысцкіх сіл, якія морам крыві заліваюць землі Іспаніі і Кітая, супроць агрэсараў, знішчыўшых незалежнасць аўстрыйскага народа, супроць надыходзячай небяспекі сусветнай вайны. Першае мая будзе днём далейшага згуртавання сіл народнага антыфашысцкага і адзінага пролетарскага фронта. У гэты дзень ва ўсіх краінах будзе высока ўзвівацца непераможны чырвоны сцяг, на якім вогненымі літарамі засвецяцца вялікія словы: Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Першае мая для працоўных нашай радзімы — радаснае і шчаслівае свята, дзень агляду нашых перамог і дасягненняў, дзень мабілізацыі сіл вялікага совецкага народа на барацьбу за далейшыя перамогі комунізма

У дзень Першага мая народ нашай неасяжнай краіны Советаў будзе дэманстраваць бязмежную адданасць комуністычнай партыі і правадыру народаў — таварышу Сталіну, сваю гатоўнасць высока трымаць і надалей сцяг большэвіцкай пільнасці, граміць і выкарчоўваць рэшткі прэзрэнных фашысцкіх бандытаў. Словамі першамайскіх лозунгаў ЦК большэвіцкай партыі наш народ ад края і да края, ад мора і да мора гаворыць:

«Ліквідуем поўнасцю ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі вынікі шкодніцтва права-трацкісцкіх наймітаў замежных разведак! Ператворым СССР у непрыступную крэпасць соцыялізма!».

Сёння, як і заўсёды наш многамільённы народ ад мала да вялка, дэманструючы свае грандыезныя поспехі ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, будзе мыслямі з пролетарыятам капіталістычных краін, пашле «Братам па класу, вязням капітала, ахвярам крывавага фашысцкага тэрора, барацьбітам за перамогу рабочага класа ў дзень Першага мая наша пролетарскае прывітанне!».

Вялікае свята Першае мая супадае з пачаткам выбарчай кампаніі ў Вярхоўны Совет БССР, а таксама з выбарамі ў Вярхоўныя Советы іншых брацкіх Саюзных Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

На сцягах першамайскіх дэманстрацый нашай квітнеючай Совецкай Беларусі начартаны лозунгі ЦК ВКП(б), якія заклікаюць працоўных выбраць у Вярхоўны Совет БССР доблесных патрыётаў нашай радзімы, непахісных барацьбітоў за соцыялізм, лепшых людзей, адданых да канца справе Леніна—Сталіна.

Наша студэнцтва, наша шчаслівая моладзь у дні першамайскіх свят будзе рапартаваць партыі і ўраду аб сваёй неаслабнай барацьбе за авалодванне большэвізмам, авалодваннем навукай, культурай, ваеннай справай і ўмацаваннем абароназдольнасці краіны.

Першага мая ўвесь совецкі народ прадэманструе сваю баявую гатоўнасць ў любы момант стаць на абарону радзімы.

«Если завтра война, если враг нападет,
Если темная сила нагрянет,
Как один человек весь советский народ
За свободную Родину встанет!» —

так упэўнена і цвёрда гучаць па ўсёй краіне словы баявой песні.

Першамайская дэманстрацыя яшчэ раз пакажа вялікую сілу совецкага народа, які ідзе ўпэўнена наперад пад непераможным сцягам Маркса—Энгельса — Леніна—Сталіна, пад знакам міжнароднай пролетарскай салідарнасці.

Няхай жыве 49 маёўка міжнароднага пролетарыята!

Няхай жыве 1 Мая — баявы агляд рэволюцыйных сіл міжнароднага пролетарыята!



